ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
19
лістапада
чацвер
№ 31(1552)

Беларускі універсітэт

Тэлетайп

Учора · сення · заўтра

СХОД

партыйнага, навукова-педагагічнага і студэнцкага актыву адбыўся ва універсітэце. На ім разгледжана пытанне «Аб рабоце калектыву універсітэта па рэалізацыі Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Матэрыялы сходу актыву будуць надрукаваны ў бліжэйшым нумары газеты.

А. МАКСІМАЎ.

НА ПАСЯДЖЭННІ

прэзідыума прафкома абмеркаваны вынікі справаздач і выбараў у прафсаюзных арганізацыях універсітэта і вызначаны задачы прафсаюзнага актыву па правядзенню абмену прафсаюзных дакументаў.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

XXXVI СПАРТАКІЯДА

БДУ імя У. І. Леніна пачалася правядзеннем асенняга кросу. І месца прысуджана мехмату, II — хімічнаму факультэту, III — ФПМ.

Д. ВІЛЬКІН.

НАРОДНЫ АРКЕСТР

народных інструментаў БДУ імя У. І. Леніна выехаў сёння ў Харкаў. Яны пазнаёмяцца з месцамі баявой і працоўнай славы, наведаюць Харкаўскі дзяржаўны універсітэт. Аркестр выступіць з канцэртнай праграмай перад студэнтамі і мясцовымі жыхарамі.

У. МАКАРЭВІЧ.

СПАРТЫЎНА-ТЭАТРАЛІЗАВАНАЕ

студэнцкае свята, прысвечанае 70-годдзю Вялікага Кастрычніка, сабрала шмат удзельнікаў і гледачоў. У праграме яго — спаборніцтвы студэнцкіх каманд па валейболу, баскетболу, настольнаму тэнісу, мініфутболу, культурна-пацяшальная праграма. Мужчынскія зборныя універсітэта на валейболу і баскетболу былі ў спартыўных спаборніцтвах мацнейшымі і занялі першае месца.

У заключэнне свята адбыўся вечар адпачынку.

В. ШХІНЬЯН.

ТЭАТР-СТУДЫЯ

філалагічнага факультэта «Летуценнік» выступіла са сваёй праграмай у час дэкады самадзейнага і прафесійнага тэатральнага мастацтва, што нядаўна праходзіла ў Мінску. У праграме маладога тэатра-студыі — сцэны з п'есы Я. Купалы «Паўлінка» і інш.

А. САЎЧЫК.

УСЕСАЮЗНЫЯ ДНІ ФІЗІКА

Напярэдадні

БАДАЙ, цяжка зараз сустрэць ва універсітэце чалавека, які б упершыню чуў пра Усесаюзныя дні фізіка, што ў поўным разгары, і не імкнуўся трапіць на іх мерапрыемствы. На жаль, гэтыя радкі пісаліся напярэдадні адкрыцця УДФ па прычыне таго, што матэрыялы нумара здаюцца ў набор у панядзелак-аўторак. Таму няхай чытач не скардзіцца на тое, што яго газета па аб'ектыўнай прычыне не паспявае аператыўна адлюстроўваць падзеі УДФ-3.



НА ФОТАСКЛЕЙЦЫ: Аргкамітэт, УДФ-3 заняты адной справай — з максімальнай аддачай закончыць падрыхтоўчы перыяд Дзён. Буйным планам (фота ўнізе) — старшыня аргкамітэта Аляксандр Мукавозчык. Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

Напярэдадні адкрыцця Дзён мы сустрэліся, напэўна, з самай цяпер папулярнай асобай на факультэце і ва універсітэце — старшынёй аргкамітэта ДФ Андрэем Мукавозчыкам.

— Андрэй, як заканчваецца адзін з галоўных перыядаў Дзён — падрыхтоўчы?

— На разасланыя запрашэнні атрымалі пацверджанні. Разлічвалі, што колькасць удзельнікаў-гасцей будзе 150, а іх — 180. Гэта, зразумела, прыемна, хаця і некалькі ўскладняе нашу работу. Далей. Гатовы білеты, помнім пра рэкламу, «наглядку». Можна сказаць, што мастакі Л. Глушко, І. Чарніцкая, Т. Расолька, С. Пержухаў, А. Карпель і іншыя ўвесь час працуюць літаральна сагнуўшыся ў тры пагібелі — малююць, пішуць, расклаўшы паперу прама на падлозе ў калідорах фізфака.

— Фізфак даволі актыўна заклікаў студэнтаў іншых факультэтаў прымкнуць і дапамагчы ў правядзенні Дзён. Прынамсі, патрабавалася, як я памятаю, адзіная якасць — не ўменне, а жаданне, бо справа для жадаючага знойдзецца заўсёды. Думаецца, жадаючых адгукнулася шмат?..

— Але. Каб так яно было. Уся ініцыятыва студэнтаў універсітэта вылілася ў просьбы наконт білетаў. Толькі юрысты самі выказалі жаданне выступіць на сцэне ў час Дзён.

— Ці можаце, Андрэй, у такім выпадку скардзіцца на недахоп памочнікаў?

— Зразумела, чым больш ініцыятыўных творчых людзей робяць справу, тым з большай гарантыяй можна спадзявацца на яе поспех. Думаецца, такую гарантыю забяспечвае актыўнасць Светы Аляксандравай, Сяргея Мацуковіча, Ігара Якуты, Дзмітрыя Патаповіча, Вадзіма Пажывілкі, Ігара Грачыхіна, Ігара Мыцько, Тані Чаркасавай, Светы Пац, Лены Амбражэй — усе яны члены аргкамітэта УДФ-3, які налічвае каля 50 чалавек. Яшчэ ў састаў аргкамітэта ўваходзяць гіды...

— А ці ўсё падрыхтавана да прыезду дэлегацый? Дзе яны будуць жыць, харчавацца?

— Харчавацца — за свой кошт. А жыць... Як я ўжо гаварыў у папярэдняй інфармацыі «Засталося зусім нямнога (гл. нумар «Беларускага універсітэта» ад 12 лістапада 1987 года), да нас едуць 22 дэлегацыі з 18 гарадоў краіны. Жыць ім давядзецца там, дзе мы зможам іх размясціць. Нягледзячы на тыя абставіны, што перад тым, як даваць заяўку на сталіцу УДФ-3, мы параіліся з кіраўніцтвам БДУ і высветлілі, што універсітэт зможа прыняць і размясціць 150 чалавек, нягледзячы на загад рэктара аб падрыхтоўцы пакояў і размяшчэнні гасцей — гэта пытанне раптам ператварылася ў загадкавую праблему. Сямдзесят чалавек будуць жыць у інтэрнаце № 6 на пакуль свабодных месцах падрыхтоўчага аддзялення, трыццаць — яшчэ не ведаем дзе і пяцьдзесят, меркавалася, змогуць жыць у нашым «другім доме» — інтэрнаце № 2. Але выраз «другі дом» у даным кантэксце не самы ўдалы. Наш інтэрнат хутчэй асобная федэрацыя, якая выйшла за межы студгарадка, бо загад рэктара, «упрыгожаны» шматлікімі візамі, для каменданта зусім не загад. Што, як не амбіцыя і прага да ўласнага спакою, прымусілі яе заявіць: «Няхай мне сам міністр загадвае — не засялю!». А можа Таісія Мікалаеўна Ланюк такім чынам рэпеціруе на свята рэпрызу «З каменданта — у Банапарты»?

Андрэй замоўк, зірнуўшы на гадзіннік.

— Я затрымліваю?

— Не, але каб мне не спазніцца... Пытаешся, як справы з «Гаўдэмусам»? «Гаў-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ЛІСТ РАСЧАРАВАНАГА ЧАЛАВЕКА

Як гэта гучыць цяпер?

ШТО НІ КАЖЫЦЕ, а ў сваёй дзейнасці сённяшні камсамол нагадвае тэатр, які састарэлым рэпертуарам і непрафесійнай ігрой акцёраў даўно ўжо не прывабліве гледача. Кіраўніцтву ж па-ранейшаму здаецца, што спектаклі праходзяць пры поўным аншлагу: усе месцы займаюцца школьнікамі, якім настаўнікі ўсоўваюць білет, пагражаючы нездавальняючай адзнакай.

Аб тым, што такі фальшыва створаны спосаб дзейнасці ў імгненне вока перастае існаваць, калі знікае сіла, якая яго падтрымлівала, сведчыць прыклад нашага філасофскага аддзялення. Страцілі сваю ролю палітінфармацыі і іншыя мерапрыемствы, значна паменшылася колькасць камсамольскіх сходаў. Словам, мы адмовіліся ад усяго таго, за што змагаліся настаўнікі. Між тым, у нас вучацца ў асноўным былыя актывісты, якія і самі неаднойчы з'яўляліся генератарамі папяровай дзейнасці.

Я ўпэўнены: усякія паперкі маюць каштоўнасць толькі там, дзе адсутнічае канкрэтная работа. Скажыце ад шчырага сэрца, агледзеўшыся навокал: ці ёсць зараз рэальная карысць грамадству ад камсамола? Амаль ніякай. Нам прапануюць адзіны рэцэпт: давайце выконваць свае абавязкі добрасумленна, тады знікнуць усе праблемы. Выходзіць, цяпер ніхто, і камсамольскія важакі таксама, не працуе належным чынам. Чаму? Відавочна з той нагоды, што трэба займацца не папяровай імітацыяй дзейнасці (як рабілі мы доўгі час), а стварэннем умоў для сапраўднай працы. Для гэтага перш за ўсё трэба знішчыць фармальныя перапоны ў самой арганізацыі.

Толькі чалавека камуністычных поглядаў і даду жыцця, з максімумам станоўчых якасцей мы маем права называць камсамольцам. А калі малады чалавек такімі якасцямі яшчэ не валодае? Яго трэба ВЫХОЎВАЦЬ І ТОЛЬКІ ПОТЫМ ПРЫМАЦЬ У САЮЗ. Аб якасці гэтага выхавання ў наш час мяркуюць, падлічваючы колькасць новых членаў: многа — добра, мала — кепска. Ці не ў гэтым прычына таго, што «перадавая частка» складаецца амаль з усіх юнакоў і дзяўчат?

А камсамольскі білет? Ён губляе сваю святасць, калі ўжо не згубіў наогул, і ператвараецца... у пропуск да вышэйшай адукацыі (іменна так і адбываецца, бо без яго нельга і думаць пра тое, каб вучыцца на аддзяленні філасофіі і, мабыць, складана паступіць на іншыя факультэты). Вы памятаеце дзень, калі атрымалі камсамольскі білет? А

(Заканчэнне на 3-й стар.).

каб хто-небудзь з вучняў 8—10 класаў не меў на руках гэтага «пуцявога ліста» у фармалізм? Наадварот, запрашаюць, прымушаюць. Але ж актыўнасць пад прымусам не развіваецца (мне, напрыклад, смешна, калі ўсе камсамольцы групы аднадушна згаджаюцца з праектам пастановы — ісціна ж нараджаецца ў спрэчках!); а праўда і адданасць справе губляюцца (сумняваюся, што камсорг, рыхтуючы справаздачу для камісіі, верыць хоць аднаму яе радку). Адсюль і адносіны да камсамола наогул. Разгледзім звычайны (!) выпадак. Згубіўся камсамольскі білет. Самога камсамольца гэта не надта хвалюе, ды і група хутчэй за ўсё толькі паспачувае. Бюро ж райкома вынесе вымову. Не асуджэнне з боку таварышаў баіцца камсамолец, хоць яно і павінна, на мой погляд, стаць гаўліковай картцы, якая можа нейкім чынам уплываць на яго далейшае жыццё. Ці можа быць што-небудзь страшней за зняважлівыя адносіны?

І як ацэньваць актыўнасць камсамольцаў на існуючай у наш час грамадска-палітычнай атэстацыі? Не піша камсорг у афіцыйнай паперы, што Мацвеў пачаў ставіцца больш добразычліва да таварышаў, а Пятроў нагрубіў. Таму аб якасці гаворым пакуль няшмат, усё больш аб колькасці выкананых даручэнняў райкома ці камітэта камсамола: колькі палітінфармацый правялі, колькі чалавек прысутнічала на канферэнцыі, якое па ліку пасяджэнне камітэта камсамола праходзіць... Пачакайце! Калі ўжо вы не зразумееце, што неабходным і карысным з'яўляецца толькі тое, што мы выбіраем добраахвотна, колькі б сіл і энергіі ні ўкладвалі ў справу кіруючыя органы,— яна не кранецца з месца.

Таму што штучна навязаныя зверху справы нас не цікавяць.

Д. ВАЛАСНІКОЎ,
студэнт гістарычнага факультэта, аддзяленне

«ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ...»

Гэты матэрыял быў сабраны з роздумаў студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі аб праблемах, якія іх хвалююць. Цытаты без тлумачэнняў — іх дакладна перададзеныя думкі.

«Няма чалавека, які быў бы як Востраў, сам па сабе: кожны чалавек ёсць частка Мацерыка, частка Сушы...»

(Д. Дон, англ. паэт XVIII ст.).

* * *

ХАЦЕЛІ б ці не хацелі мы таго, але агульныя, хвалюючыя ўсіх праблемы стаялі, стаяць і будуць стаяць вышэй асабістых. Нават людзей зусім незнаёмых, далёкіх адзін ад аднаго настолькі, што духоўнае збліжэнне іх амаль немагчыма, але якія жывуць у адным грамадстве, будуць хваляваць адны і тыя ж грамадскія пытанні. І нішто не можа змяніць гэта, як і сцвярджэнне, нібы адбываецца адасабленне асобных груп або асоб у кола дробных клопатаў.

* * *

ЛЕТАМ бачыў у калгасе, як брыгадзір упрошваў камбайнера вярнуцца на рабочае месца. Напярэдадні гэтага камбайнера не пакармілі ў полі.

— А што я, галодны працаваць буду?!

— Але ж уборка, хлеб гарыць...

— Ну дык а мне якая справа? Карміць трэба было на полі.

* * *

«ЛЮДЗІ сталі жыць лепш, не хачу сказаць, што ад гэтага яны сталі горшымі». Мы ўсе сёння трываць не можам фармалізму, выступаем за барацьбу з ім на ўсіх франтах, нікога не задавальняе ўжо «суботнік для галачкі», ніхто не можа мірыцца з тым, што справа гіне з-за таго, што «адной паперкі не хапіла», а большасць абураецца таму, што «мерапрыемства ператвараецца ў мерапрыемства».

Як моцна кранаюць нас справы, якія адбываюцца ў камсамоле. Не ўкладваецца ўсё ў стаўшыя нейкім новым шаблонам, модным штампам словы пра тое, што арганізацыя вычарпала сябе. Дыскусія наконт гэтага не толькі шкодная, але і стыхійна выбірае зусім іншы напрамак.

* * *

УЧОРА мой брат прыйшоў з рок-канцэрта, скінуў пракляпаную скуранку і выцягнуўся ў крэсле.

Пытаюся:

— Ну, як?

— Здорава, па металу, як па рэйках.

Вочы гараць, язык ад захаплення заплятаецца, рукі нервова ўздрыгваюць.

* * *

«НУ, ДОБРА, камсамол перастане існаваць — дапусцім (хоць цяжка выкрасліць з гісторыі яго справы). Але праблемы ўсё роўна застануцца. Прасцей за ўсё крыкнуць: «Гэта дрэнна, значыць, не патрэбна!» А хто ж будзе справу рабіць?»

Так, страчана многае: вера ў чыстыя ідэалы, наогул шчырасць. Але няўжо мы не ў стане нічога змяніць? І няхай за вуаллю прыгожых слоў мы разгледзелі, што XX з'езд быў падобны на XIX, XVIII, што камсамол да сённяшняга дня топчацца на месцы, не выходзім на суботнікі ў чырвоных хусцінках і не прышпільваем на грудзях пунсовых банцікаў. Але гэта яшчэ не прычына для апошняга крыку душы — крыку роспачы. Мы, магчыма, дасягнулі большага, чым згубілі

* * *

МОЙ ДЗЕД удзельнічаў у Фінскай вайне.

— Дзядуля, а за што вайна была?

— Мы папярэдзілі агрэсію.

— Але ж мы першыя напалі, выходзіць, мы агрэсары — чужую тэрыторыю захапілі.

— Не, мы папярэдзілі.

Дзед такі не адзін. У школьным падручніку пра Фінскую вайну ледзь-ледзь палавіна старонкі тэксту, у якім вострыя вуглы запілены напільнікам ...

* * *

ДОМА на маім пісьмовым стале ляжаць дзве кнігі. першым — палескія, а на другім — тэхаскія.

* * *

ПЕРАБУДОВА хвалюе ўсіх. Толькі не сакрэт, што ёсць падставы гаварыць: «Перабудова ідзе там, дзе нас няма». Які кантраст паміж перадавымі артыкуламі цэнтральных

пайшла. Ці не праўда, вельмі знаёмае, да болю. Мы пераходзім мяжу славеснай дазволенасці. Нас няма каму больш трымаць у строгіх рамках. Толькі дзе ж тыя людзі, якія год-два назад тушылі нашу ініцыятыву? Перабудаваліся? Але адкуль яшчэ светлыя мары пра тое, што «імя камуніста верне сабе былую чысціню і святасць». Адкуль трывога: а ці не вырасцім мы пакаленне дэмагогаў?

* * *

«ТОЕ, ШТО дасягнута за семдзесят гадоў, магло б быць дваццаць гадоў назад. Але пры адной вельмі важнай умове: пры зацікаўленых адносінах кожнага (!) да сваёй справы. Уявіце, якімі спецыялістамі будуць тыя студэнты, якім усё роўна, дзе вучыцца: дыплом аб вышэйшай адукацыі ўсюды аднолькавы».

* * *

«Колькі б па тэлебачанню, радыё ні гаварылі, колькі б ні пісалі ў газетах аб перабудове, галоснасці, аб рэформе школы, аб тым, што патрэбна праяўляць ініцыятыву... Пакуль са школы будуць выходзіць людзі, якія засвоілі толькі павярхоўнае ўспрыманне і разуменне перамен, што адбываюцца ў грамадстве, і якія ўмеюць толькі шмат гаварыць на каляпадзейныя тэмы, грамадства далёка не пойдзе.

Асаблівых зрухаў у адносінах да працы не відаць. Супакойваем сябе тым, што зараз мы можам адкрыта пакрытыкаваць любога кіраўніка. На жаль, не любога — баімся. Магчыма, я памыляюся, але мне здаецца, што людзі не адчуваюць перабудовы.

Як не ўспомніць тут словы французскага філосафа Кандзільяка пра тое, што нішто так не цудоўна, як ісціна. Аднак не ўсякая ісціна цудоўная. Таму ў нас на ўсё выпрацоўваецца нейкі крытычны погляд. Прыемна ўсведамляць, што погляд гэты накіроўваецца перш за ўсё на акружаючых нас людзей. «Мы зараз перажываем перыяд нейкай заспакоенасці» — сапраўды, але ці цудоўна гэта? Цудоўна іншае — мы бачым, што «каб ускалыхнуць мяшчанскае балота, у якім мы гразнем, патрэбен магутны стымул».

У чым жа заключаецца гэты стымул? Магчыма, у захаванні нашай прыроды ці прыроды і чалавецтва ў цэлым. А можа, у адраджэнні беларускай нацыянальнай культуры: не сакрэт, што «мы губляем родную мову. А праз яе ж мы атрымоўваем духоўныя багацці свайго народа, традыцыі — нашу спадчыну, якая абнаўлялася, збіралася стагоддзямі нашымі папярэднікамі».

У маёй вёсцы ёсць пабудова XVI стагоддзя, якая знаходзіцца ў страшэнным стане. Гадоў пяць абяцаюць пачаць рэстаўрацыю, але воз і сёння там. А гэта цудоўны помнік даўніны. Хіба можна так адносіцца да сваёй спадчыны. Гэта ж старонка нашай гісторыі.

* * *

СЛОВЫ «70-годдзе» і «Кастрычнік» я ўсё часцей чую тут, ва універсітэце (з выкладчыцкай кафедры), бачу плакаты на кіёсках, дзе напісана: «Слава Кастрычніку!». Але гэтых слоў я не чуў у размовах на вуліцы, пра гэта ніколі не гавораць мае сябры.

* * *

ЁСЦЬ у народзе прымаўка пра тое, што чым пастаянна гаварыць аб недахопах, то лягчэй іх выправіць, таму што яны заўсёды на віду. Спрэчная, зразумела, ісціна. Але ёсць і іншая: «Колькі ні гавары пра цукар, у роце соладка не стане». Тому мала ўголас крычаць пра тое, што ўсё ўсюды дрэнна, усюды недахопы. Патрэбна выпраўляць іх. А праблем многа. І няхай гэта гучыць банальна, але вырашаць іх давядзецца нам.

Артыкул падрыхтаваны рэдкалегіяй насценнай газеты «Журналіст» факультэта журналістыкі.

ФОТАРЭПАРТАЖ З ПАМЕТКАЙ «БЫЛО»

УПЕРШЫНЮ... Няма больш прыемнага і звыклага слова для першакурсніка, чым гэта. У жыцці за некалькі месяцаў столькі маланкавых змен, што дух захапляе. Цэлы букет пачуццяў ад радасці да смутку падорыць яму паступленне. Чыстая залікоўка і студэнцкі білет — першыя ўзнагароды пасля сур'ёзнага экзамена на сталасць. Але ж і пасля гэтага ўсё роўна ён яшчэ не зусім сапраўдны студэнт і адчуе сябе канчаткова такім у свой дзень, у дзень пасвячэння ў першакурснікі.

Іменна такі непасрэдны, з гумарам і жартамі, адбыўся ён нядаўна на факультэце журналістыкі. Аб вясёлым і гарэзлівым настроі сведчаць гэтыя фотаздымкі. Якім аказалася наша папаўненне? На радасць усім — цікавым і непасрэдным, з добрым гумарам і сур'ёзным позіркам на жыццё. Пра гэта гаворыць не толькі вечар, але і падборка меркаванняў першакурснікаў пра перабудову «Там, дзе мы ёсць...»

А. МАКСІМАЎ.
Фота АЎТАРА.

* * *

НАМ «далі свабоду дзеянняў, запалілі зялёны перад ініцыятывай». Камсамольцы прынялі гэта на «ура» і ўзяліся страсна абмяркоўваць свае праблемы. Надышоў перыяд бурнай крытыкі, размоў пра тое, што ўсё ў нас дрэнна. Але што самае страшнае — далей гэтага справа не

Фотаальбом «Дарога № 1» аб развіцці сельскай гаспадаркі ў Брэсцкай вобласці і амерыканскі часопіс — таксама на гэту тэму. Як яны падобныя!

Парадныя рады камбайнераў на жніве, сімпатычныя парасяты на фоне белых халатаў, суперсучасныя комплексы, фешэнебельныя катэджы, толькі пейзажы на газет і тым паўсядзённым жыццём, той сферай, у якой мы пастаянна знаходзімся! Там, дзе мы ёсць, па-ранейшаму цішыня ды супакой, і толькі час ад часу праглядвае тонкі прамень святла. Нельга сказаць, што не характэрна для нашага часу пытанне: «Дакуль мы ўсё лепшае будзем трымаць у вузкіх рамках эксперыменту».

НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

Вуліца Берута, 22. Гэты адрас добра вядомы работнікам народнай асветы не толькі Мінска, але і ўсёй рэспублікі. Тут знаходзіцца кніжны магазін № 19 «Метадычная кніга».

РАЗМЕШЧАНЫ ён у новым памяшканні. Вялікія плошчы гандлёвых залаў дазваляюць зручна расставіць літаратуру па аддзелах. А іх у магазіне тры: грамадска-палітычнай, навукова-педагагічнай і мастацкай літаратуры. Асноўным жа з'яўляецца аддзел навукова-педагагічнай літаратуры. Тут вы можаце знайсці метадычныя дапаможнікі па

ЗАПРАШАЕМ ДА НАС ЗАВІТАЦЬ

ўсіх прадметах школьнага курса, выданні па агульнай педагогіцы, узроставай псіхалогіі, даведачныя выданні па пытаннях сярэдняй школы і педагагічнай адукацыі ў СССР, літаратуру па пазакласнай і пазашкольнай рабоце, па дашкольнаму выхаванню і дэфекталогіі.

Асартымент навукова-педагагічнай літаратуры ў магазіне даволі поўны і разнастайны. Для таго, каб задаволіць патрэбы спецыялістаў, мы заказваем усю літаратуру, якая плануецца да выпуску выдавецтвамі «Просвещение», «Педагогика», «Народная асвета». Акрамя таго, магазін штогод заказвае літаратуру па планах выпуску выдавецтваў.

Дарэчы адзначыць, што «Метадычная кніга» з'яўляецца апорным пунктам выдавецтваў «Народная асвета» і «Просвещение». Гэта дае нам перавагу перад іншымі магазінамі ў пастаўцы літаратуры гэтымі выдавецтвамі.

Я ўпэўнены, што, наведаўшы наш магазін, вы абавязкова выбераце пакупку па густу. Заўважу, што студэнтам таксама карысна было б бываць тут: зараз толькі ў нашым магазіне можна аформіць папярэднія заказы на літаратуру па планах выпуску выдавецтваў «Педагогика», «Народная асвета», «Просвещение». Пазнаёміцца з гэтымі планамі і ўмовамі прыёму папярэдніх заказаў можна ў прадаўцоў-кансультантаў ці таваразнаўцы магазіна. Яна акажуць вам і кваліфікаваную дапамогу ў камплектаванні вашай асабістай бібліятэкі неабходнай спецыяльнай літаратурай.

Студэнты выпускнога курса могуць аформіць папярэднія заказы на адрас накіравання на пастаяннае месца работы, стаць на пастаяннае камплектаванне асабістай бібліятэкі метадычнай літаратурай па сваёй спецыяльнасці. Для гэтага неабходна запоўніць картачку спецыяліста, у адваведнасці з якой новыя кнігі па названаму профілю будуць высланы адрасату адзелам «Кніга — поштай» у адпаведнасці з паступленнем іх у магазін.

Для тых, хто ўсё ж выбраўшыць наведаць наш магазін, паведамляем, што мы працуем з 10.00 да 19.00 гадзін.

С. ВЯЗАЎКІН.

Самакіраванню быць!

Пасля прыняцця ў чэрвені гэтага года Пастановы «Аб першачарговых мерах па расшырэнню ўдзелу студэнтаў у кіраванні вышэйшымі навучальнымі ўстановамі» ва універсітэце робяцца першыя, але ўпэўненыя крокі ў даным напрамку.

У АПОШНІМ нумары «Беларускага універсітэта» акрамя «Палажэння аб студэнцкім самакіраванні ў БДУ імя У. І. Леніна» была надрукавана анкета «Выкладчык вачыма студэнта», якая дае магчымасць студэнту ацаніць якасць выкладання, што ў сваю чаргу з'яўляецца своеасаблівым актам у справе дэмакратызацыі універсітэцкага жыцця.

Праблем у справе пашырэння дэмакратыі аднак безліч. З якога боку пачынаць? Што рабіць у першую чаргу? І тут на дапамогу могуць прыйсці гісторыя і вопыт.

— Вопыт? — здзіўлена перапытае чытач.

Так, так. Сапраўдныя добрыя традыцыі дэмакратыі ВНУ ў БДУ імя У. І. Леніна ёсць. Аб гэтым расказаў аспірант кафедры гісторыі КПСС Аляксандр Бендзін у час дыспуту «Дэмакратыя ўнутры ВНУ і грамадска-палітычнае жыццё студэнтаў канца 20-х — пачатку 30-х гадоў».

Што паслужыла падставай звярнуць увагу іменна на гэты час?

Канец 20-х гадоў у многім быў пераломным у гісторыі нашай краіны. Адбываліся карэнныя змены ў грамадска-палітычным жыцці. Гэта давала вялікі прастор для далейшага развіцця сацыялістычнага ладу, асновай якога заўсёды была дэмакратыя. Працэс дэмакратызацыі ў першую чаргу закранаў будучую інтэлігенцыю — студэнтаў ВНУ і, зразумела, Белдзяржуніверсітэта.

Статут БДУ 1928 года юрыдычна замацаваў шырокія правы студэнтаў. У той час яны мелі магчымасць выбіраць на агульным сходзе рэктара і дэканаў, удзельнічалі ў рабоце прыёмных і стыпендыяльных камісій. Меркаванні студэнтаў мелі вялікую вагу ў час складання планаў вучэбнага працэсу — яны ўваходзілі ў састаў кафедраў. Вялікую папулярнасць набыло анкетаванне. Прынамсі, акрамя пытанняў, якія датычаць непасрэдна жыцця ВНУ, анкеты ахоплівалі і шмат іншых праблем (напрыклад, адносіны паміж мужчынам і жанчынай).

Зразумела, што ва ўмовах шырокай дэмакратыі вялікі размах набыла крытыка і самакрытыка. Студэнты актыўна крытыкавалі нават высокапастаўленых асоб Наркамасветы ў час выступленняў на сходах, на старонках прэсы. І гэта крытыка мела дзейснасць.

Ступень дэмакратыі, як вядома, залежыць ад аўтарытэту грамадскіх арганізацый. Вялікую ролю ў гэтым сэнсе адыгрывала прафсаюзнае аб'яднанне студэнтаў — «Пралетстуд». Яго актывісты сталі сапраўднымі змагарамі за інтарэсы студэнцтва. У сярэдзіне 30-х гадоў арганізацыя была расфарміравана. Яе функцыі ўзяў на сябе камсамол. І, як бачым, не зусім змог іх выканаць...

60 ГАДОЎ НАЗАД І СЁННЯ

Наогул, канец 20-х — пачатак 30-х гадоў быў вельмі цікавым і надзвычай складаным, супярэчлівым часам — часам пошукаў новых форм навучання, новай маралі ў быце, часам, калі вялікая класавая і нацыянальная неадназначнасць студэнцтва рабіла цяжкімі пошукі новага. Але студэнты актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным руху як ўнутры ВНУ, так і за яе сценамі. Цікавае выказванне тав. Молатава аб студэнцкім руху: «Вельмі часта ВНУ знаходзяцца ў руках студэнтаў, моладзь нярэдка сама загадвае ў ВНУ».

Такім чынам, вопыт ёсць, і ад яго адмаўляцца мы не павінны. Добра ведаючы мінулае, лягчэй і спадручней рашаць праблемы сённяшняга часу. Іменна таму ў пытаннях, якія прагучалі пасля лекцыі, былі закрануты важныя праблемы як уласна студэнцкія, так і агульнадзяржаўныя.

Вось некаторыя з іх.

Пытанне. З якой колькасці кандыдатур выбіралі рэктара студэнты і выкладчыкі? Ці была ў іх якая-небудзь так званая перадвыбарная кампанія?

Адказ: Ніякая перадвыбарная кампанія не рабілася. Была прадстаўлена кандыдатура В. І. Пічэты. Гэта быў паважаны чалавек. Яго добра ведалі і студэнты, і выкладчыкі, таму выбралі рэктарам. Трэба сказаць, што на выбарах прысутнічала каля 2000 чалавек. Гэта сведчыць аб тым, што студэнтаў было значна больш, чым выкладчыкаў.

Пытанне. Якія гады лічаць пачаткам згортвання дэмакратыі?

Адказ. Можна сказаць, пачатак 30-х гадоў. Пачалося ўмацаванне ролі шматнага апарату, сталі менш увагі надаваць грамадскай думцы. З гэтага часу і замянілі выбарнасць рэктара прызначэннем.

Пытанне. У 20-я гады студэнты былі больш зацікаўленыя ў атрыманні ведаў. Зараз вялікая колькасць іх ідзе ў ВНУ толькі за дыпломам. У гэтым плане многія дэмакратычныя формы ў ВНУ, на мой погляд, прыносяць шкоды вынік. Ці так гэта?

Адказ. Справа ў тым, што інжынер у той час зарабляў у 2,5 раза больш, чым рабочы. Высокае становішча, добрае матэрыяльнае забеспячэнне клікалі да вучобы. Ды і адносіны да яе былі ў асноўным добрасумленныя. Ваша пытанне гаворыць пра тое, што для сённяшняй дэмакратыі неабходна абнаўленне многіх сацыяльных бакоў жыцця.

Пытанне. Ці можна параўнаць анкетаванне 20—30-х гадоў з сённяшнім, і ці ў многім яно адрозніваецца?

Адказ. У нашым цэнтральным архіве захавалася багата дакументаў па гэтаму пытанню. З іх бачна, што сённяшнія анкеты ў параўнанні са старымі больш аднабаковыя, сухія. Гэта можна растлумачыць тым, што ў той час у людзей было вялікае жаданне пабудаваць новую мараль, была вялікая ўпэўненасць, што за кароткі тэрмін можна перабудаваць сумленне чалавека.

Пытанне. Які ў той час быў памер стыпендыі і як яна размяркоўвалася?

Адказ. У 1928 годзе стыпендыя была 20 рублёў. Гэта мала. Аднак заробак рабочага складаў таксама недзе каля 100—120 рублёў. Прафсаюз студэнтаў выступіў за павышэнне стыпендыі. Была думка павысіць яе да ўзроўню заробку рабочага. Так, у 1930 годзе стыпендыя стала складаць 35, а ў 1936 — ад 90 да 150 і нават амаль 200 рублёў. Стыпендыя залежала і ад таго, на якім курсе вучыцца студэнт. Так, на I курсе яна была 90 рублёў, на II — 100, на III — 120 рублёў. Яшчэ трэба сказаць, што пры размеркаванні стыпендыі ўлічваліся як дасягненні ў вучобе, так і грамадская актыўнасць.

Пытанне. Ці мае сэнс зараз зрабіць асобны прафсаюз тыпу «Пралетстуда»? Тады многія пытанні, якімі займаецца камсамол, лягуць на яго плечы.

Адказ. Магчыма, вы правы. Можа гэта і патрэбная справа.

Пытанне. Скажыце, наколькі дзейсным быў уплыў студэнтаў на фарміраванне вучэбнага працэсу? Таму што, на мой погляд, гэта зараз амаль немагчыма.

Адказ. Студэнты вырашалі самі, колькі будзе лекцыйных гадзін, колькі — семінарскіх, арганізоўвалі з выкладчыкамі сумесныя рэйды па кантролю за дзейнасцю кафедраў, выказвалі свае думкі аб якасці чытання лекцый, аб адносінах выкладчыкаў і студэнтаў, аб грамадскай рабоце. Усё гэта сведчыць пра тое, што ў студэнтаў была максімальная магчымасць аказваць уплыў на вучэбны працэс.

Аднак нельга гаварыць, што сёння гэтых магчымасцей у студэнтаў няма. Насупраць! Апошнія пастановы партыі і ўрада прадастаўляюць шырокае поле дзейнасці студэнцкаму самакіраванню. Зараз раз у пяць гадоў будуць выбірацца рэктар, дэканы факультэтаў. Шырэй уводзяцца формы анкетавання. Студэнты маюць магчымасць аказваць уплыў на састаўленне раскладу заняткаў. Іх прадстаўнікі ёсць у саставе вучоных саветаў факультэтаў, універсітэта. Так што за работу!

Такім чынам, усе ўмовы для ажыццяўлення прынцыпаў студэнцкага самакіравання створаны. Іменна поўнае скарыстанне гэтых дэмакратычных прынцыпаў і будзе нашым укладам у агульную перабудову.

С. АНАНІЧ,
А. КАНАВАЛЕНКА,
студэнты факультэта журналістыкі.

Напярэдадні

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

дэамус» рамантуецца і рамантуецца. Чым сёння займаецца АГЧ — загадка. Рабочыя схадзілі перакласці нанава паркет, які ўздыбіўся, а пакрыць лакам, адшліфаваць — аб гэтым іх трэба ісці і прасіць асобна. Такое ўражанне, што, каб не Дні фізіка, «Гаўдэамус» рамантаваўся б да новага года.

— А як з білетамі? Ці хопіць на ўсіх?

— Не ведаю, ці хопіць, ведаю, што нават пры вялікім жаданні ніхто не ахопіць усе святы, не прапусціўшы ніводнага мерапрыемства. Свята арганізоўваецца на прынцыпах самафінансавання. Гэта значыць, што грошы, выручаныя за білеты, пойдуць на расходы, звязаныя з УДФ-3. Тыраж білетаў каля 8 тысяч, прыкладна адна чацвёртая пойдзе на патрэбы аргкамітэта, гасцям, другая частка — універсітэту, яшчэ адна чацвёртая — іншым ВНУ і 1500 білетаў — фізфаку. Гэта, зразумела, прыкладны разлік. А калі патрэбны больш дакладны, калі ласка, ля дзвярэй камітэта камсамола факультэта —, інфармацыя: куды, колькі білетаў пайшло на нашым факультэце канкрэтна.

Трэба адзначыць, што гарадскі студклуб пры РК Белсаўпрофа аказвае нам значную дапамогу ў рашэнні многіх пытанняў, напрыклад, у арандаванні некаторых пляцовак і памяшканняў. Значыць, частка выручаных грошай належыць яму. Астатнія грошы пойдуць на экскурсіі, сувеніры, «салодкія» сталы, прызы, іншыя артыкулы расходаў.

— Прызы... Дарэчы, аргкамітэт абвяшчаў конкурс на лепшую эмблему да Дзён. Хто атрымаў прыз?

— Як тут адказаць... Перамагаць у конкурсе прыйшлося нам самім. Можа няма ва універсітэце мастакоў? Сумняваюся. На нашым факультэце знайшліся ж! Так што эмблему прыдумвалі самі. Яе аўтар — студэнт IV курса Віктар Рэба.

— Вясёлы, у ліхіх джынсавых брыджах, іграючы на гармоніку... каларадскі жук. Ён крочыць па бульбяному полю. Настрой у яго, як бачна, добры. Але чаму ўсё-такі ён?

— Бо Дні фізіка такія ж жыццеўстойлівыя. На гэтым падабенства канчаецца, гэта запішыце і выбачайце...

Андрэй зноў зірнуў на гадзіннік і пабег па аўтобус для рабочых — трэба ж паркет у «Гаўдэамусе» неяк давесці да парадку...

Да пачатку Усесаюзных дзён фізіка заставалася тры дні.

А. ВІХРОВА.

Афіша УДФ

ДАСТАЦЬ БІЛЕТ НА УДФ-3 — ГАЛОЎНАЯ ПРАБЛЕМА НАШЫХ ДЗЁН!

ДЗЕНЬ III, ЧАЦВЕР, 19 ЛІСТАПАДА

Вы рана радуецеся, калі мяркуеце, што ў сераду пабачылі ўсіх гасцей! Сёння вы ўбачыце іх не менш. Не сумуйце, калі вы не трапілі на запіс тэлеКВЗ. Выступае каманда КВЗ Новасібірскага дзяржаўнага універсітэта.

ДЗЕНЬ IV, ПЯТНІЦА, 20 ЛІСТАПАДА

Палац культуры Белсаўпрофа прымае гасцей УДФ-3, што далёка не рашае галоўную праблему нашых дзён...

«Тлеюць кастрамі сінія ночы...» і іншыя песні — на вечары «Фізікі спяваюць».

ДЗЕНЬ V, СУБОТА, 21 ЛІСТАПАДА

Музычны рынг — гэта ўбогая пародыя на канцэрт-рынг з удзелам каманд КВЗ: МФТІ і НДУ.

ДЗЕНЬ VI, НЯДЗЕЛЯ, 22 ЛІСТАПАДА

Як вы думаеце, чаму перамагла каманда КВЗ Адэсы? Сольны канцэрт даюць тыя, хто забяспечыў перамогу — Адэскі клуб вясёлых сустрэч?

Вы нічога не бачылі, калі не трапілі на закрыццё УДФ-3! Выступаюць усе! Гала-канцэрт!

АРГКАМІТЭТ УДФ-3.

БАЙЦЫ РЭВАЛЮЦЫІ

ЖЫЦЦЁ — ПОДЗВІГ

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 28, 29, 30).

1942 год. Вера Захараўна са сваёй групай перайшла лінію фронта. Будучыя падпольшчыкі шчасліва дабраліся да торфапрадпрыемства «ХХ гадоў Кастрычніка» пад Віцебскам, дзе базіраваўся партызанскі атрад М. Ф. Біруліна. Тут Вера Захараўна звязалася з арганізатарам абкома партыі, сакратаром Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б Кудзінавым. Некаторы час спатрэбіўся, каб вывучыць абстаноўку ў Віцебску. Вера Захараўна імкнулася да таго, каб хутчэй перакінуць усю групу ў горад і пачаць дзейнічаць.

Хвалюючымі дакументамі аб жыцці, настроях і непахіснай волі савецкіх людзей, якія трапілі пад часовую акупацыю, з'яўляюцца яе пісьмы з Віцебскага падполля. Усяго яна напісала 12 пісьмаў. Апошняе было ад 6-га лістапада 1942 года. У лістападзе Вера Захараўна Харужая разам са сваімі сяброўкамі Соф'яй Панковай, Еўдакіяй Сураковай, Клаўдзіяй Балдачовай і сям'ёй Вераб'ёвых была арыштавана. Прычыны правалу да гэтага часу застаюцца тайнай, разгадаць якую, можа, дапаможа час.

Р. БУЛАЦКІ,
доктар гістарычных навук, прафесар.

14 ЛІСТАПАДА... у суботу... абарвалася жыццё нашага сябра — Андрэя АКУЛІКА...

Спынілася сэрца...

Мы ўсе добра ведалі яго. Студэнт IV курса, сакратар камітэта камсамола, актыўны ўдзельнік будатрадаўскага руху, урэшце, проста Чалавек з вялікай літары, ён найперш за ўсё запомніўся нам сваёй вялікай дабрынёй, спагадлівасцю, чуласцю.

З яго імем звязаны нашы першыя крокі перабудовы грамадскага жыцця на факультэце, работа па-новаму камітэта камсамола, рэальныя зрухі ў паляпшэнні культурнага жыцця студэнтаў...

Але мы, сябры і блізкія Андрэя, заўсёды будзем памятаць яго не толькі як сакратара. Ён быў сапраўдным Сябрам, Чалавекам, якіх мала... Вельмі мала ў нашым жыцці.

Ён не мог нікому адмовіць у просьбе, заўсёды прыходзіў на дапамогу, адгукаючыся на чужы боль як на свой. Зрабіў для нас вельмі многа і імкнуўся зрабіць яшчэ і яшчэ больш.

Заняткі навукай, напружаная вучоба, пастаянная грамадская нагрузка — усё гэта разам не магло не ўплываць на яго здароўе — у яго ж было надарванае сэрца.

Ён пайшоў на дэманстрацыю ўжо хворым. Прастуда... Пасля падскочыла тэмпература,

але яго чакалі людзі, і ён працягваў працаваць. Канчаткова злёг толькі ў апошнія чатыры дні.

І вось у суботу ўвечары сэрца не вытрымала...

Андрэя больш няма. Але ён заўсёды будзе жыць з намі! У нашых справах, у нашай памяці.

ДЭКАНАТ, ПАРТБЮРО, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА, СЯБРЫ І РОДНЫЯ.

1. У Даліне Прывідаў





МЕСЦА ВЫБРАНА — КРЫМ. ІМЕННА ТАМ ДАЎНО ТРЭБА БЫЛО ВІБРАМЫ БЕЛАРУСКІХ ТУРЫСТАЎ. ПРАВЕРЫЦЬ ІХ. ВЫКАНАННЕ ГЭТАЙ ЗАДАЧЫ ВЫПАЛА НА ДОЛЮ ЧАТЫРОХ ГРУП ШКОЛЫ СЯРЭДНЯЙ ТУРЫСЦКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ПАД АГУЛЬНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ КАНСТАНЦІНА ЛАТЫШАВА. МАРШРУТ БЫЎ АДЗІН, УМОВЫ АДНОЛЬКАВЫЯ, А ВОСЬ ПАХОДЫ АТРЫМАЛІСЯ РОЗНЫЯ. ЧАТЫРЫ ГРУПЫ, ЧАТЫРЫ КАЛЕКТЫВЫ...



Прадчуванне паходу

31.X.1987 г.

ЦЯГНІК спыняецца на некалькі хвілін. На невялічкай станцыі Паштовай — ніводнага пасажыра. З дазволу касіра залу разбіваем на чатыры сектары, кожная група размяшчаецца на сваім месцы, уладкоўваемся прама на падлозе. А на вуліцы ліхтары высвечваюць пачатак дарогі, сад, бліжэйшыя дамы. Якім паўстане перад намі Крым? Для многіх сустрэча з ім будзе першай, і зараз усе жывуць чаканнем.

— А мне ў той вечар было проста добра,— расказвала потым Таня Сцяшэнка.— Добра, што ад'ехалі далёка-далёка ад дому, што навокал Крым, а побач незнаёмыя, але такія шчырыя людзі. Прадчуванне паходу — гэта як эпілог да цікавага расказу.

Першы хадавы дзень

1.XI.1987 г.

ГРУПА Кін-Камінскага:

— У гэты дзень адбылося збліжэнне нашага калектыву. Справа ў тым, што палова групы з Мінска, палова — з Вілейкі. Адзін аднаго раней не ведалі і зараз многа расказвалі пра ранейшыя паходы, дзяліліся планамі, карацей, адапціраваліся.

Група Дубовіка:

— У першы ж дзень да нас прыбіўся невялічкі сабачка. Адкуль узяўся — ніхто і не заўважыў, проста выскачыў з-за кустоў і пабег побач з камандзірам. Машка (так назвалі спадарожніцу) прайшла з намі ўвесь маршрут. Жартаў хапіла на ўсю дарогу: «Гэта ж адзіная «дзяўчына» ў нашым калектыве».

У групе Лашука таксама папаўненне: сустрэчныя турысты, якія ўжо завяршалі свой маршрут, перадалі дзяўчатам кацяня.

— Не паход, а заалагічны сад,— абураўся камандзір.— Але кацяня ўзялі, паставілі на забеспячэнне і пасля доўгіх спрэчак назвалі Гематагенам.

У групе Левіна (як і ва ўсіх астатніх) працягвалася знаёмства, прыцірка характараў. Апоўдні ўсе групы амаль адначасова выйшлі да пячорнага горада. Хоць і развіталіся зусім нядаўна, хоць і пазнаёміцца яшчэ як след не паспелі, але першая сустрэча была на дзіва радаснай. Толькі і чулася:

— Прывет лашукоўцам!

— Прывітанне, кін-камінцы!

А потым усе зачаравана разглядалі пячоры, збудаваныя ветрам, вадой і часам. Нікога не пакідаў узнёслы святочны настрой — гэта ж Крым, сапраўдны Крым!

Як мага вышэй

2.XI.1987 г.

ГРУПА Кін-Камінскага:

— Здалёк убачылі Чатыр-Даг. Гара ўразіла, доўга не маглі зразумець: што гэта, снег ці сланец ляжыць на вяршыне? Калі наблізіліся, упэўніліся, што гэта ўсё ж снег. Усе радаваліся: нам вельмі пашанцавала, што ўбачылі такую прыгажосць здалёк.

Група Дубовіка ўвесь дзень ішла без вады. Раніцай, каб закіпяціць чай, злілі з усіх фляг астаткі ўчарашняй. Вечарам спыніліся ля гарбаносай скалы, з якой танюсенькай струйкай выцякаў ручаёк. Дзесяць мінут патрэбна было стаяць, каб напоўніць адну фляжку.

Лашукоўцам пашанцавала больш: яны зрабілі прывал каля паўзасохлай рачулкі. Калі вада ўжо добра нагрэлася, заўважылі, што ў катле плавае жаба. Пад вечар групы Лашука і Левіна падняліся на плато: ім захацелася пабываць у зіме, а на ім ляжаў снег. Паволі падкралася светлая месячная ноч.

— Можа пойдзем далей,— жартаўліва прапанаваў Коля Арапаў.— Відно гэтак жа, як днём, а спаць зараз халаднавата.

Тузін выпрабаванняў

3.XI.1987 г.

ТУМАН. Адыходзіш ад палаткі на дзесяць крокаў і нібы акунаешся ў малако. Ад учарашняй прыгажосці не засталося і следу. Тры групы ідуць след у след, але кожны бачыць толькі некалькі чалавек перад сабой. Цярушыць снег. Нудны, непрыемны. Нечакана пярэднія спыняюцца: далей нельга зрабіць і кроку — правал. Спрабуем зазірнуць уніз, але глядзіш нібыта на белую паперу. Па сваіх жа слядах вяртаемся назад, спрабуем спусціцца ніжэй. Здаецца, туман пануе на ўсёй зямлі: выплываюць і знікаюць вяршыні скал, неахвотна саступаюць з дарогі букі-веліканы, а перад тварам калышацца рэчмяшок таварыша. Паступова ўзнікае адчуванне, што мы пакрысе паварочваем у другі бок. Турысцкі этыкет не раіць пярэчыць камандзіру, групы шушукаюцца, але паслухмяна паўзуць за чырвонымі камандзірскімі рукзакамі. Толькі калі спыніліся на развілцы дарог, якую праходзілі напярэдадні, Саша Анцыповіч не ўтрымаўся: «Я так і думаў, што сюды выйдзем».

— Ну і нічога,— жартуе камандзір,— няправільныя сцежкі заўсёды больш вытаптаныя, бо турысты ідуць па іх два разы: туды і назад.

Жарты жартамі, але не надта прыемна ўсведамляць, што дарэмна гадзінамі мясілі снег. Затое як ля старога знаёмага спыняемся ля ўчарашняга ручайка, упэўнена ўзбіраемся на плато — як-ніяк учора добра разведалі дарогу.

Група Кін-Камінскага таксама падымаецца на плато, акунаецца ў малочнае месіва. Як тут знойдзеш сцежку на Сасноўку? Нечакана ўбачылі сляды атары, ускарыўшы хаду, дагналі пастуха. Той развёў рукамі:

— Прабачце, хлопцы, я і сам заблудзіўся...

Дубовік спыніў сваю групу, вырашыў зрабіць разведку. Калі вярталіся назад (сляды ўжо замяло), упэўнена ішлі за Машкай.

Група Левіна набрыла на каньён. Як абысці яго? Тут думкі раздзяліліся. Адны прапанавалі кіраваць направа, другія — налева, а трэція наогул выказалі жаданне павярнуць назад. Камандзір жа вырашае спускацца ўніз. Крок, яшчэ адзін. Постаць камандзіра становіцца ледзь бачнай у тумане, хвіліну ўсе моўчкі глядзяць услед. Таня Сцяшэнка кранаецца з месца першай. Група расцягваецца, недзе ўнізе разведвае дарогу Саша Левін, замыкае, як заўсёды, Ігар Драбышэўскі. А туман такі, што не відаць ні нізу, ні верху каньёна. Кавалачак крутога схілу, альпеншток у руках, рэчмяшок за плячыма, таварышы побач — вось твой свет у гэты момант. І ва ўсіх адна надзея, адна мара — вырвацца з гэтай туманнай завесы, зразумець, нарэшце, дзе мы знаходзімся. Спускаемся. Дно каньёна амаль сухое. Спрабуем ісці па ім, але дарэмна: зноў трэшчына. Трэба падымацца наверх.

Дубовік у час разведкі знаходзіць сцежку, праводзіць групу праз каньён без пад'ёмаў і спускаў.

Кін-Камінскі спыняецца ля самага пачатку каньёна. Група падзяляецца: частка на чале з Арнольдам ідзе нізам і праз паўгадзіны знаходзіць сцежку, а Кін-Камінскі шукае яе больш за дзве гадзіны. У групе першы раскол.

Саша Левін спыняецца на доўгачаканай сцежцы, паварочваецца да групы:

— А зараз кожны можа

РЭСТАРАН у Перавальным. Кін-камінцы толькі што вырваліся з каньёна, нерашуча патапталіся ў фае, паглядзелі на люстраную падлогу, бялюткія абрусы. Выйшла афіцыянтка, рукі ў бокі:

— Што, нанеслі мне гразі і есці не хочаце? А ну, сядайце за сталы!

...Перавал Ангарскі. Турбаза. Таня Сцяшэнка выменяла на беларускія цукеркі велізарны кавун. Раздзялілі яго на ўсе групы — сапраўднае свята пасля такога цяжкага дня.

(Працяг будзе).

С. ПЛЫТКЕВІЧ,
наш кар.
Фота АЎТАРА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
19 лістапада 1987 г.
Зак. 1595.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.